рамліва нацягвалі спадніцы на каленкі, каб не паказваць зашытых дзірачак ці пакрытых лякам для пазногцяў зацяжак. Цэлыя *калготкі* жанчыны ашчаджалі, каб апрануць у тэатар, на важнае спатканьне ці да лекара. А ў прыбіральнях ці ванных пакоях на сьценах можна было ўбачыць кардонныя фігуркі заходніх прыгажуняў, выразаныя з каробачак з-пад *калготак*.

Напрыканцы 80-х у моду ўвайшлі *калготкі* двух колераў — ружовага і блакітнага. Іх насілі ўсе. Чорныя *калготкі* таксама не выходзілі з моды.

Цяпер добрыя *калготы* ў Беларусі каштуюць каля пяцёх даляраў ЗША. Віцебскія і берасьцейскія вырабы назваць пяшчотным словам „*калготкі*“ цяжка, як і аддаць за іх нават сымбалічную грашовую суму. Самыя зграбныя ножкі будуць незаўважаныя: увага зафіксуе агідны цагляны колер.

Мужчыны любяць паўтараць, што мацней вабяць усё ж панчохі. А беларускія жанчыны збольшага выбіраюць *калготкі*, і прычына не ў абыякавасьці да сябе, яны проста ведаюць — што ні апрані, мужчынская ўвага хуткаплынная.

## Калёнія

***Рыгор Барадулін***

На лаціне „*colonia*“ — селішча.

Слова шматзначнае. Гэта — і супольнасьць птушак і жывёлаў, і сукупнасьць грамадзянаў якой-небудзь дзяржавы ў іншай краіне, гэта і краіна пад уладаю чужой дзяржавы, мэтраполіі.

У *калёніях* птушак і жывёлаў дзейнічае закон сілы і парадку, натуральны адбор, суладзьдзе з прыродай. У людзей, як заўсёды, усё болей вытанчана ў сваёй жорсткасьці ды вонкава прыхавана. І розныя папраўчыя, жаночыя ды дзіцячыя працоўныя *калёніі* трымаюцца на прымусе, на прыдушэньні волі асобы.

У савецкай імпэрыі *калёніі* называліся сацыялістычнымі рэспублікамі. У Беларусі ў свой час спрыялі прагрэсу *каляністы*, асабліва зь Нямеччыны. Яны ставілі элеватары, млыны, лесапільні, будавалі камяніцы. *Калёніі* гэтыя вылучаліся высокай культурай земляробства, рознай вытворчасьці і рамёстваў. Багата на нашых землях было і пасяленцаў-*каляністаў* латышоў.

І ў гады рэпрэсіяў ці ня ўсе *каляністы* былі сасланыя ў Сібір, раскулачаныя. Адно назовы вёсак нагадваюць яшчэ пра *каляністаў*, руплівых ды кемлівых гаспадароў.

Слова *калёнія* паступова сыходзіць з актыўнага ўжытку у разнастайных сваіх значэньнях. Хіба толькі застаецца ў асноўным, як азначэньне месца адбыцьця пакараньня.

## Калыханка

***Віталь Цыганкоў***

Зьбеглі зайкі ўсе ў лясы,
Змоўклі птушак галасы,
І буслы ў гняздо схавалі
Свае доўгія насы.